• **Майстар на ўсе рукі**



Васіль Пілiпавiч Зуеў (на здымку) з тых, зара чыйго дзяцінства прыйшлася на ваеннае ліхалецце, а юнацтва і маладосць — на пасляваенную разруху і галечу.

Самастойна зарабляць на хлеб пачаў у дванаццаць год у родным калгасе «Чырвоны маяк». Быў і даглядчыкам жывёлы, і пастухом. Пасля арміі падаўся на цаліну — хацелася ж маладому хлопцу крышачку прыапрануцца, накапіць грошай для будучай жаніцьбы. Адпрацаваў там шэсць год і вярнуўся ў родныя Баханы.

Вось ужо дванаццаць гадоў працуе Васіль Піліпавіч аператарам па адкорму буйной рагатай жывёлы. Вопытнаму жывёлаводу спрыяе ў рабоце вялікае пачуццё адказнасці за даручаную справу, добрасумленнасць, любоў да сялянскай працы.

У вольны ж час любіць Васіль Піліпавіч папрацаваць з рубанкам, сякерай. Днямі вырашыў ён крыху падладзіць уласную лазню, плот падрамантаваць. За гэтай справай і засталі мы з нашым фотакарэспандэнтам С. Бабровай Васіля Піліпавіча — бадзёрага ад свежага восеньскага паветра, у добрым настроі.

**Майстар на ўсе рукі** // Шлях Кастрычніка. — 1991. — 29 лістапада. — С. 2.
*Васіль Піліпавіч Зуеў, аператар па адкорму буйной рагатай жывёлы у калгасе «Чырвоны Маяк».*